**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”**

**Зацвярджаю**
Першы прарэктар УА "БДУКМ"
_________________Ю.П.Бондар
"_____" _______________ 2011 г.

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

**Вучэбная праграма**
**для студэнтаў спецыяльнасці**
**1 - 18 01 01 “Народная творчасць” (па напрамках)**
**Напрамак спецыяльнасці**
**1 - 18 01 01-04 "Народная творчасць " (Народныя рамёствы)**

Мінск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Рынкевіч У.І. - прафесар кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Пракапцова В.П. – доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

Лойка Г.В. – дацэнт, загадчык кафедры методыкі адукацыі і мастацтва УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка"

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 20.01.2011);

Навукова метадычным саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №            ад                    )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс “Уводзіны ў спецыяльнасць” распачынае вучэбны працэс па прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва па спецыяльнасці 1 - 18 01 01-04 "Народная творчасць " (Народныя рамёствы). Ён прызначаны дапамагчы студэнту адаптавацца да асаблівасцяў і патрабаванняў навучальнага працэсу ў ВНУ, сфарміраваць устаноўку на стварэнне аптымальнага рэжыму вывучэння спецыяльных дысцыплін, якія азначаны адукацыйным стандартам Рэспублікі Беларусь і вучэбным планам па гэтай спецыяльнасці. Дадзеная вучэбная дысцыпліна мае непасрэднае дачыненне да ўсіх дысцыплін цыклу дэкаратыўнага і выяўленчага мастацтва, асабліва да вучэбных прадметаў: "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва", "Гісторыя ДПМ" і цыкла дысцыплін па выяўленчаму мастацтву.

У працэсе навучання студэнт павінен набыць тэарэтычныя веды па структуры і формах акрэсленыя праграмай, пачатковы вопыт самастойнай працы ў інфармацыйнай прасторы і работы са спецыяльнай літаратурай, а таксама засвоіць элементарныя навыкі самастойнай працы і арганізацыйнай работы ў галіне культурна-асветніцкай дзейнасці.

**Галоўная мэта курса** - сістэматызацыя і дапаўненне пачатковага ўзроўню ведаў студэнта ў галіне традыцыйнага і сучаснага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, стварэнне тэарэтычнага базіса вывучэння спецыяльных дысцыплін і прывіццё навыкаў засваення інфармацыйнай культуры спецыяліста.

**Задачы курса:**

- падрыхтоўка студэнтаў для паглыбленага тэарэтычнага і практычнага засваення асноўных катэгорый мастацтва;
- пашырэнне базісных ведаў у галіне народных рамёстваў і промыслаў, а таксама прафесійнага мастацтва;
- наданне элементарных арганізацыйна-метадычных навыкаў у галіне культурна-асветніцкай і мастацкай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Курс “Уводзіны ў спецыяльнасць” складаецца з лекцыйных, практычных, і самастойных заняткаў. У час праходжання курса выкарыстоўваюцца наступныя віды і формы вучэбнай работы: акадэмічныя лекцыі з дэманстрацыяй нагляднага матэрыялу (арыгіналы твораў мастацтва, слайды), практычныя заняткі с запрашэннем народных майстроў, прафесійных мастакоў і даследчыкаў мастацтва. Самастойна студэнтам прапануецца рэгулярна наведваць мастацкія выстаўкі і музейныя экспазіцыі, аналізаваць іх змест, знаёміцца з мастацтвазнаўчымі артыкуламі. Формай фіксацыі атрыманых матэрыялаў з'яўляюцца нататкі аб наведванні выставачных экспазіцый і сустрэчах з майстрамі мастацтва.

Формай кантролю атрыманых ведаў і навыкаў з’яўляецца залік.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен

***ведаць:***

- структурную ўзаемасувязь спецыяльных дысцыплін у вучэбнай праграме спецыялізацыі “народныя рамёствы”.

– спецыяльную тэрміналогію, прынятую ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

– Традыцыйную класіфікацыю відаў мастацкай творчасці і асноўныя этапы развіцця нацыянальнага мастацтва;

***умець:***

– арыентавацца ў асноўных пытаннях па гісторыі і тэорыі дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва;

– самастойна весці адбор літаратуры, аналізаваць матэрыялы, канспектаваць і рэферыраваць літаратурныя крыніцы;

– выказваць ў вуснай і пісьмовай формах свае погляды па пытаннях

мастацтва, ацэньваць выставачныя экспазіцыі і асобныя творы мастакоў;

Праграма разлічана на студэнтаў, якія маюць пачатковыя веды і навыкі ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | *Тэма* | *Лекцыі* | *Практычныя* |
|---|---|---|---|
| 1. | Тэма 1. Уводзіны. Дысцыпліна "Уводзіны ў спецыяльнасць" як дыдактычная форма ведаў па тэорыі і практыцы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў. | 2 | |
| **2.** | Тэма 2. Спецыяльнасць "Народная творчасць" (кірунак "Народныя рамёствы") у кантэксце культурна-асветніцкай і мастацка-адукацыйнай дзейнасці. | 2 | |
| 3. | Тэма 3. Традыцыйная народная, аматарская і прафесійная формы творчасці ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. | 2 | 2 |
| 4. | Тэма 4. Разнастайнасць відаў традыцыйных рамёстваў і промыслаў Беларусі. | 6 | 2 |
| 5. | Тэма 5. Сучасны стан вывучэння, захавання і развіцця традыцыйнага нацыянальнага мастацтва. | 4 | |
| | УСЯГО | 16 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Тэма 1. Дысцыпліна "Уводзіны ў спецыяльнасць" як дыдактычная форма ведаў па тэорыі і практыцы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў.**

Мэты і задачы курса “Уводзіны ў спецыяльнасць” для студэнтаў спецыяльнасці 1 - 18 01 01-04 “Народная творчасць” (“Народны рамёствы”). Арганізацыя вучэбнага працэсу. Патрабаванні да пісьмовых і вусных работ. Метадычныя ўказанні да наведвання музеяў, мастацкіх галерэй выставачных залаў, творчых майстэрняў мастакоў і народных майстроў, канспектавання спецыяльных навуковых і папулярных выданняў па мастацтву. Дакументальныя крыніцы інфармацыі па гісторыі нацыянальнай культуры,

аб сучасных падзеях мастацкага жыцця краіны і ў свеце. Крытэрыі ацэнкі эстэтычных і матэрыяльных каштоўнасцяў твораў мастацтва. Тыповая перыядызацыя эвалюцыйнага шляху беларускага мастацтва. Асноўныя гістарычныя мастацкія стылі і разнастайнасць індывідуальных манер творцаў. Спецыяльная тэрміналогія выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Паняцці: “мастацтва”, “рамяство”, “майстэрства”, “мастацкі вобраз”, “твор мастацтва”, “творчы працэс”, “мастак”, “народны майстар” і інш.

**Тэма 2. Спецыяльнасць "Народная творчасць" (кірунак "Народныя рамёствы") у кантэксце культурна-асветніцкай і мастацка-адукацыйнай дзейнасці.**

Сістэма планавання і арганізацыі вучэбнага працэсу. Роля аўдыторных заняткаў (лекцыйныя, практычныя) і самастойнай работы студэнтаў у авалоданні прафесійнымі навыкамі па мастацтву. Узаемасувязь вучэбнай, навукова-даследчай і творчай дзейнасці студэнтаў. Гісторыя кафедры Народнага ДПМ БДУКМ.

Асноўныя прафесійныя патрабаванні да спецыяліста кваліфікацыі "Мастак народных рамёстваў. Выкладчык". Узровень прафесійных ведаў і навыкаў у галіне жывапісу, скульптура і графікі. Традыцыйна-жанравая і сучасныя сістэмы класіфікацыі твораў выяўленчага мастацтва. Творчыя дасягненні сучасных беларускіх мастакоў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Віды метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці спецыяліста: метадычных указанняў па відах дзейнасці, збіранне і апрацоўка эмпірычнага матэрыялу, выступленне на навукова-практычных канферэнцыях, удзел к конкурсах. Асноўныя патрабаванні да арганізацыйна-метадычнай работы з народнымі майстрамі. Асабістая творчая дзейнасць. Удзел ў рабоце творчых саюзаў (грамадскіх аб'яднаннях), выставачнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 3. Традыцыйная народная, аматарская і прафесійная формы творчасці ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.**

Мастак ў культурным жыцці грамадства. Здольнасць, талент, геніяльнасць - якасныя ацэнкі асобы творца. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя кампаненты творчасці. Творчая індывідуальнасць мастака, народнага майстра. Беларускія мастакі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сутнасць мастацкай выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной самадзейнасці. Сацыяльная значнасць самадзейнай творчасці. Функцыянальны змест прафесійнага мастацтва, народнай творчасці і аматарскай самадзейнасці ў галіне культурна-дасугавай і мастацкай дзейнасці. Віды і формы выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці народных майстроў і аматараў мастацтва. Індывідуальная і калектыўная формы работы аматараў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тэндэнцыі развіцця народнай мастацкай творчасці (арыентацыя на прафесійнае ("вучонае") мастацтва, "гарадскі фальклор"). Інсітнае мастацтва (тэндэнцыя прымітывізму), як вядучы карунак непрафесійнага мастацтва. Распаўсюджанне масавай культуры на самадзейную творчасць. Пазітыўныя і негатыўныя ўплывы навукова-тэхнічнага прагрэсу на развіццё традыцыйнага мастацтва.

*Практычны занятак.*

Арганізацыя і правядзенне экскурсіі ў творчую майстэрню мастака, або майстра народнай творчасці сіламі студэнтаў. У гэтай сувязі – апрацоўка матэрыялу аб мастаку, падрыхтоўка сцэнарыя сустрэчы (асноўныя пытанні), рашэнне арганізацыйных праблем. Аналіз праведзенага мерапрыемства.

**Тэма 4. Разнастайнасць відаў традыцыйных рамёстваў і промыслаў Беларусі.**

Спосабы класіфікацыі відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па матэрыялах і спосабах іх апрацоўкі. Этнакультурныя і мастацкія асаблівасці развіцця традыцыйнага народных рамёстваў і промыслаў у рэгіёнах Беларусі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія склаліся гістарычна: Цэнтральная частка, Паазер'е (Прыдзвінне), Панёманне, Падняпроўе, Заходняе і Усходняе Палессе. Асноўныя цэнтры традыцыйных промыслаў.

Класіфікацыя відаў традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Фарміравання відаў і эвалюцыя матэрыялаў і абсталявання традыцыйнага ткацтва. Рамізнае ткацтва: тэхналогія, віды вырабаў. Карункаванне, вышыўка, вязанне - неад'емныя кампаненты традыцыйнага нацыянальнага тэкстылю. Нацыянальныя строі адзення: рэгіянальныя, гістарычныя і сацыяльныя своеасаблівасці, рэчаўная камплектацыя ансамбляў, колеравая і арнаментыка-сімантычная характарыстыка аздаблення адзення. Беларускія народныя паясы. Слуцкія паясы. Маляваныя дываны, набіванкі, пісанкі. Выцінанкі: віды, тэхніка вырабу. Мастацкая апрацоўка скуры, косці, каменя. Роспіс архітэктурна-дэкаратыўная, па рэчах побыту (беларускія куфры). Ганчарства: эвалюцыя, тэхналогія і віды вырабаў. Кераміка: архітэктурна-дэкаратыўная, дэкаратыўна-ужытковая і мастацкая пластыка. Мастацкая дрэваапрацоўка: архітэктурна-дэкаратыўная пластыка, аздабленне рэчаў побыту, дэкаратыўныя пано і круглая скульптура. Разнастайнасць тэхнік разьбы і інкрустацыіі. Лоза- і саломапляценне: дэкаратыўна-ужытковая аб'ёмная пластыка, аплікацыя. Традыцыйныя дэкаратыўныя вырабы з саломы, лазы, бяросты. Мастацкая апрацоўка чорных і каляровых металаў (ліццё, кавальства, чаканка, чарненне, філігрань і інш.). Мастацкае шкло: гісторыя промыслу, тэхналогія і віды вырабаў.

*Практычны занятак.*

Правядзенне сустрэчы з майстрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў асяроддзі выставачнай экспазіцыі або ў Цэнтры народнай творчасці (Доме народных рамёстваў). Абмеркаванне актуальных пытанняў сучаснага стану і развіцця нацыянальнага народнага мастацтва Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Знаёмства з асаблівасцямі арганізацыі творчага працэсу і выставачнай дзейнасці.

**Тэма 5. Сучасны стан вывучэння, захавання і развіцця традыцыйнага нацыянальнага мастацтва.**

Сацыяльная значнасць вывучэння і захавання традыцыйнага народнага мастацтва Беларусі. Дзейнасць у гэтым кірунку дзяржаўных музейных устаноў: Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі і яго філіі, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Музей старажытнабеларускай культуры (Нацыянальная акадэмія навук Рэспублікі Беларусь), Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Веткаўскі музей народнай творчасці і інш.. Роля музеяў па захаванню і прапагандзе нацыянальнага народнага мастацтва. Прыватныя зборы аб’ектаў этнаграфіі і народнага мастацтва.Прапаганда народнага мастацтва праз рэспубліканскі электронныя сродкі масавай інфармацыі і перыядычны друк: часопіс ”Мастацтва”, штотыднёвікі “Літаратура і мастацтва”, “Культура”. Выданне энцыклапедычных даведнікаў і спецыяльнай навуковай літаратуры, манаграфічных прац беларускіх вучоных-даследчыкаў традыцыйнай народнай творчасці: В.І.Жука, М.Кацэра, М.Ф.Раманюка, Я.М.Сахуты, Р.Ф.Шауры і інш.

Дзейнасць вядучых навукова-даследчых і вучэбных устаноў рэспублікі у галіне традыцыйнага і сучаснага мастацтва: Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі  і фальклору НАН, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.Танка, Бабруйскі дзяржаўны каледж прыкладнога мастацтва і інш. Падрыхтоўка спецыялістаў у галіне традыцыйнага мастацтва ў сярэдніх навучальных установах рэспублікі. Значэнне фестываляў, конкурсаў, выставак, канферэнцый у прапагандзе і развіцці традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

### Асноўная


1. Беларуская кераміка:[альбом] / Аўт.тэксту і складальнік В.Г. Гаўрылаў.– Мн.: Беларусь, 1984. – 174с.
2. Віннікава М.М. Скарбы з вясковых куфраў:традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі "Народнае мастацтва беларусскага Палесся": ілюстраваны каталог / М.М. Віннікава, П.А. Богдан. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2009. – 180, [2] с.: каляр. іл.
3. Маленко Л.И. Белорусский костюм XIX – XX вв. / Л.И. Маленко. – Минск: Белорусская наука, 2006. – 140с.
4. Народныя мастацкія рамёствы Беларусі: метад. дапам. / Уклад. Я.М. Сахута. – Минск: Беларусь,1996. – 168с.
5. Починова Н.В. Белорусская народная декоративная роспись, учебное пособие для учащихся учреждений, обеспечивающих получение профессионально-технического образования по специальности «Декоративно-прикладное искусство» / Н.В. Починова. – Минск: Вышэйшая школа, 2005. – 175с.
6. Раманюк М.Ф. Беларускае народнае адзенне:Альбом / Міхась Раманюк. – Мінск, Беларусь,1981. – 47с.,[128] л.іл.
7. Репина Т.А. Художественные изделия из соломки: спецтехнология: учебное пособие для учащихся спецучреждений, обеспечивающих получение профессионально-технического образования по специальности «Декоративно-прикладное искусство» / Т.А. Репина. – Минск: Беларусь,2006. – 286с.
8. Сахута Я.М. Народнае мастацкае кавальства / Я.М. Сахута. – Мінск: Полымя, 1990. – 15с., [1] с.іл.
9. Сахута Я.М. Беларуская выцінанка / Я.М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2008. – 227с., [3] с. іл., каляр. іл., партрэт.
10. Трызна Дз.С. Беларускія дываны і габелены / Дз.С. Трызна; [рэдактар М.М. Яніцкая]; Акадэмія навук Беларускай ССР; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Навука і тэхніка,1981. – 126 с., [1] с. іл.
11. Шаура Р.Ф. Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі: Жывапіс, графіка, скульптура / Р.Ф. Шаура. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 251с.


### Дадатковая:


1. Беларускі саюз мастакоў, 1938 – 1998: энцыкл. даведнік / Аўт. склад. Б.А. Крэпак і інш. – Мінск: ВТАА "Кавалер Паблішэрс",1998 – 663с., іл.
2. Беларусы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск,1995. – – Т.1. прамысловыя і рамесныя заняткі / [В.К. Бандарчык і інш.]. – Навука і тэхніка,1995. – 351с. :іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / [Акадэмія навук Беларусскай ССР; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы; рэдкалегія С.В. Марцэлеў (галоўны рэдактар) і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987-1994.
4. Традыцыйныя рамёствы Беларусі: Саломапляценне. Ткацтва. Вышыўка. Разьба па дрэву: Праграма для дамоў рамёстваў / Беларус. ін-т прабл. культуры; [Уклад. В.А. Лабачэўская і інш.]. – Мінск,1995. – 135с.
5. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал. І.П. Шамякін (галоўны рэдактар) і інш. – Мінск: Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1984–1987.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**1.** Народнае мастацтва Цэнтральнай Беларусі.
**2.** Народнае мастацтва Паазер'я.
**3.** Народнае мастацтва Падняпроўя.
**4.** Народнае мастацтва Усходняга і Заходняга Палесся.
**5.** Народнае мастацтва Паўночна-Заходняй Беларусі.
**6.** Мастацкая апрацоўка чорных і каляровых металаў.
7. Архітэктурна-дэкаратыўная кераміка (кафля). Дробная пластыка.
**8.** Пляценне і інкрустацыя з саломы.
**9**. Беларускае народнае адзенне.
**10.** Узорнае ткацтва. Слуцкія паясы.
**11.** Габелен.
**12.** Роспіс па рэчах побыту. Пісанкі. Выцінанкі.
**13.** Карункаванне. Вязанне. Пляценне. Вышыўка.
**14** Манументальна-дэкаратыўная разьба па дрэве.
**15.** Ганчарства.
**16** Выяўленчае мастацтва: класіфікацыя відаў.
**17.** Формы, віды і тэндэнцыі развіцця выяўленчай самадзейнасці.
**18.** Стан вывучэння і захавання народнага мастацтва. Беларускае мастацтвазнаўства.
**19.** Класіфікацыя мастацкіх выставак, методыка арганізацыі калектыўных экскурсій.
**20.** Сістэма навучання па спецыяльнасці "народныя рамёствы".
**21.** Патрабаванні да спецыяліста народных рамёстваў

Вучэбнае выданне

УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма для студэнтаў спецыяльнасці 1 - 18 01 01 “Народная творчасць” (па напрамках) Напрамак спецыяльнасці 1 - 18 01 01-04 "Народная творчасць " (Народныя рамёствы)*

Рэдактар
Падп. у друк Фармат 1/16. Папера пісчая №
Дрк афсетны. Ум. друк. аркушаў Ул.-выд. Заказ

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.
220001 Мінск. вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ